Па-другое, аднаўленне зместу і формаў культурнай дзейнасці ў вольны час, тэхнічнае пераабсталяванне сродкаў духоўна-маральнага выхавання.

Рэалізацыя гэтых задач ужо ў бліжэйшы час зможа значна павысіць эфектыўнасць выхаваўчай працы, унесці вялікі ўклад у паляпшэнне духоўна-маральнага выхавання ваеннаслужачых.

**Кажухоўская Л.С.,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## БАЗАВЫЯ СІМВАЛЫ МАСТАЦКАЙ КАРЦІНЫ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ

Не новым, але бясспрэчным з'яўляецца сцвярджэнне, што магчымасць развіцця ў галіне духоўнай культуры ў значнай ступені залежыць ад асваення, выкарыстання вопыту мінулага, апоры на традыцыю. Незалежна ад палітычнага, эканамічнага становішча для кожнага народа роздум пра лёс і сутнасць культуры, пра спадчыну, дадзеную нам продкамі, служыць той жыватворнай крыніцай, якая забяспечвае духоўнае развіццё і шмат у чым праграміруе лёс нацыі.

Змястоўна значны лад усялякай культуры мае схільнасць да крышталізацыі абагуленай вобразнасці і сімволікі, здольнай выявіць яе памкненні, сутнасць і дух, падкрэсліць яе унікальнасць. У сімвале, як у магічным крышталі, высвечваюцца асаблівасці нацыянальнай мадэлі бачання свету, спецыфічныя асаблівасці духоўнага генатыпу.

Акрэсліваючы той ці іншы сімвал, трэба адказаць на цэлы шэраг пытанняў. Як часта гэты сімвал прысутнічае ў мастацкай літаратуры і фальклоры? Як ён функцыяніруе ў дыяхроніцы? Якое дачыненне ён мае да сакральнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сферы? Як суадносіцца з супольнай свядомасцю? Які ўплыў меў на фарміраванне эстэтычных традыцый?

Безумоўна, пошук трэба пачынаць з той невычэрпнай плыні, імя якой — міфалогія. Сапраўды, як слушна адзначыў Ул.Конан, "ужо на ўзроўні міфалогіі ў агульных рысах "прачытваецца" сімвалічны план гісторыі чалавецтва і яго культуры, хоць, праўда, у ірацыянальных, фантастычных абрысах".

Першабытны чалавек безабаронны перад жахлівым абліччам прыроды. Ён поўнасцю залежыць ад трох стыхій — Зямлі, Вады, Агню. Іх ён абагаўляе, ім пакланяецца, на іх спадзяецца.

Культ Зямлі быў уласцівы ўсім народам. Гімны Рыгведы паказваюць Зямлю жонкай Неба. Грэчаская Гея-Зямля таксама з'яўляецца жонкай Урана. У славян культ зямлі захаваўся ў яго найбольш старажытнай форме - шанаванні без храмаў, абрадаў і нават без пэўнай ідэі; у аснове гэтага ляжыць усведамленне залежнасці ад зямлі і блізкасці да яе. Водгуллем паганскага культу зямлі служаць народныя вераванні, звычаі, уяўленні, зафіксаваныя этнографамі XIX — пачатку XX стагоддзя.

Так, зямля лічылася "чыстай стыхіяй". Даволі распаўсюджаным было вераванне, што не трывае маці-зямля нічога нячыстага, варожага людзям. Ліхіх "нядобразычліўцаў" у выглядзе вядзьмарак і ведзьмакоў яна не прымае, і таму існуюць спецыяльныя абрады для прадухілення выхаду з магіл такіх нябожчыкаў і наведвання імі людзей і запаветных месцаў. Нават той нябожчык, труп якога доўгі час не распадаўся, быў, паводле народнага веравання, пры жыцці вялікім грэшнікам, бо "ён не быў падрыхтаваны да пахавання ў сырой зямлі".

Беларусы верылі, што перад надыходам грамадскіх бед зямля стогне. Людзі, адораныя чуйным слыхам і пры гэтым абазнаныя ў варажбе, могуць чуць гэты стогн і загадзя прадказваць розныя беды: голад, пошасць, вайну і г.д., бо стогн зямлі мяняецца адпаведна з характарам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бяды. Так, перад голадам да стогну дадаецца плач зямлі, перад пошасцю — хаўтурныя галашэнні, перад вайной чуваць асаблівы гул, нібы ад грукату мноства ног і капытоў.

Самай страшнай клятвай была клятва зямлёй. Яшчэ ў XIX стагоддзі бандыты, абрабаваўшы падарожнікаў і не жадаючы іх забіваць, бралі з абрабаваных клятву маўчання, прымушаючы свае ахвяры паклясціся з камяком зямлі ў руках, а потым з'есці гэты камяк. Звычайна тыя, хто пакляўся, маўчалі ўсё жыццё пра тое, што з імі здарылася, і толькі перад смерцю расказвалі пра перажытае. Клятва зямлёй лічылася настолькі святой, што далёка не ўсе маглі яе вымавіць. У беларусаў гэтае права мелі мужчыны; жанчыны ж маглі толькі цалаваць зямлю, але не заклікаць яе ў сведкі.

На беларускім Палессі сяляне верылі, што асабліва цяжкі грэх — біць чым-небудзь зямлю ўвесну, да 25 сакавіка, бо ў гэты час зямля цяжарная. Гэтым часам забаранялася нават забіваць кол у зямлю, а значыць, нельга было ставіць агароджу ці што-небудзь будаваць. Думалі, што за парушэнне гэтай забароны зямля можа пакараць вінаватага засухай. Тады сяляне ламалі ў парушальніка агароджы, выкопвалі забітыя калы.

Другая стыхія, нязменна абагаўляемая ўсімі паганскімі народамі, — стыхія вады.

На рэштках веры ў боскае паходжанне вады вырасла перакананне ў яе цудадзейнай сіле, яе гаючых уласцівасцях. На тэрыторыі Беларусі была распаўсюджана назва "прошча", якая надавалася тым крыніцам, дзе маці сырая зямля зрабіла так, што вадзяная жыла, якая віруе з-пад яе, і моцная, і бесперапынная. Тут спрадвеку шукалі даравання і адпушчэння, г.зн. духоўнага і цялеснага вызвалення ад унутранага душэўнага цяжару і ад вонкавых цялесных пашкоджанняў. Імем "пращчэніка" дагэтуль завецца кожны, хто цудам выздаравеў на святым месцы. "Прошчамі" называлі славуты Чорны ручай (каля Мсціслава), крыніцы ў Лукомлі і Дзвіне (Гродзенская

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

губерня), якія выкідаюць з нетраў зямлі на яе паверхню ваду з гаючымі ўласцівасцямі, падмацаванымі верою мноства дзесяткаў пакаленняў. Адсюль прымаўка: “Ідуць, як на прошчу”.

На святках, пры гаданнях, дзяўчаты глядзелі ў ваду, каб пабачыць будучага жаніха, а варажбіткі — ворага, які зрабіў камусьці шкоду. Ведзьмакі на ваду нашэптвалі, каб наслаць бяду на злосніка. І ўвогуле, рэдкае гаданне абыходзілася без таго, каб вада не адыгрывала ў ім істотнай ролі. А самы распаўсюджаны від знахарскага лекавання ў Беларусі — “даць вады”. Вось як апісвае яго А.Багдановіч: “Бярэ знахар кубак вады, выходзіць на двор, становіцца тварам на ўсход і гаворыць над вадой замову, потым паварочваецца тварам на поўдзень і захад, кожны раз вымаўляючы адно і тое ж. Самае лепшае — рабіць гэта на ўзыходзе сонца. Нагавораную ваду п’юць, абмываюць ёй хворыя месцы, заліваюць яе ў вушы і г.д.”.

Вось прыклад замовы “супраць нутраных хваробаў”:

“У цёмным лесі стаіць гара высокая, там растуць дубы вячыстыя, там стаіць цэрква свянцоная, там бяжыць вада цудоўная. А я тую ваду брала, балючае цела абмывала, піць давала, слаўцо вымаўляла: пашла немач з цела вон!”

Бясспрэчным ужо з’яўляецца сцвярджэнне факта шчыльнай сувязі прыродна-геаграфічных рэалій (прыродна-кліматычных умоў, тыпу ландшафту) і асаблівасцей нацыянальнага светаўспрымання. Гаворачы пра беларускую этнапрастору, М.Багдановіч адзначаў: “Край беларускі лясісты, балоцісты. Вось нам і трэба ствараць паэзію лесу, паэзію дрыгвы. Украінская стыхія — стэп, у нас наша стыхія — лес і балота. Тут ёсць свая адменная краса, адменная рытміка, адменны чар”.

Менавіта таму асаблівую ўвагу беларусаў прыцягвала балота, а вобраз-сімвал балота, на думку І.Чароты (якому, дарэчы, належыць самае змястоўнае даследаванне гэтага сімвала), з’яўляецца дамінантнай адзнакай нацыянальнай сістэмы адлюстравання свету.

Першы доказ гэтаму — у мове. Як адзначае І.Чарота, "...народы Крайняй Поўначы карыстаюцца неверагоднай колькасцю слоў, якія ў іншых мовах перакладаюцца проста як "снег"; ірландцы без дай прычыны ўжываюць дзесяткі найменняў ветру — яны ж мараходы, рыбакі; у арабаў па-рознаму называецца залежна ад яе стану пясчаная паверхня пустыні... Відаць, не выпадкова і тое, што ў беларускіх гаворках на дзіва шматлікі сінанімічны рад, утвораны словамі алёс, багна, балота, бездань, віць, валага, волага, гала, дрыгва, дрыгвянік, імшара, імшарына, імшарышча, машара, мраіва, мроіва і г.д. У дачыненні да іншых відаў ландшафту падобнага не назіраецца".

Балота ўспрымалася як месца прыстанку нячыстай сілы, як пагібельнае месца, жытло чарцей, хвароб, нягод і рознага ліха. Балота звязваецца з сакральным. Вось якія замовы, прысушкі прыводзіць І.Чарота: "Ідзіце вы, зглаз-урокі, на імхі, на балоты, на тонкія архаванні, на ніцыя лозы, на гнілыя калоды" (замова ад ліхога вока); "Ступай у пні, у калоду, у гнілое балота "(замова ад ліхаманкі); "Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы ды ў мокрае балота" (замова ад зубнога болю); "Як красна сонейка ззяе, прыпякае ліхі і балоты, чорныя гразі, так і ты прыбягай, ка мне прысыхай". Згадвае І.Чарота і шматлікія касмаганічныя паданні ("Чортава балота", "Пра паходжанне д'ябла і балотаў", "Чаму чэрці ў балотах жывуць"), тапанімічныя і гістарычныя паданні ("Ад чаго Нясвіж пайшоў", "Бітва пад Лясной"). А паводле той рэканструкцыі беларускай міфалагічнай сістэмы, якую правёў С.Хмара, "балота-дрыгва чорная — пляўкі Чарнабогавы, ягоныя царствы на паверхні зямлі... выхады ў ягонае панаванне глыбокае".

У прафесійнай літаратуры вобраз балота ўжываецца амбівалентна. Часцей за ўсё — гэта сімвал цяжкай мінуўшчыны, сімвал гніласці старога жыцця. Згадаем "На прасторах жыцця" Я.Коласа: "Хай наша нядбаласць пройдзе разам з гэтым Гнілым балотам". Або ў Я.Купалы:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іх розум балота
Трымае палонна —
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

А вось "Балотны агонь" з "Казак жыцця" Я.Коласа — бледны, неразгаданы і прыемна блішчыць з-пад нізу, з нейкіх невядомых абшараў зямлі. І ў вершы М.Багдановіча "Старасць":

Спяшыць ён дайсці да трасіны:
Там — мяккія, цёплыя мхі...

"Камусьці — прыкмета нядолі, а камусьці — мяккія, цёплыя мхі", — адзначае І.Чарота. А вобраз-сімвал балота застаецца адвечным і адметным элементам беларускай мадэлі свету.

"Огневі Сварожіцю молятся", — кажа ігумен Данііл у "Слове пра ідалаў", адзначаючы распаўсюджанне ў славян культу агню.

Зрэшты, агонь абагаўляўся практычна ўсімі народамі. Так, у рымлян у храме Весты гарэў вечны агонь, які падтрымлівалі прызначаныя для гэтага жрыцы-цнатліўкі, весталкі; у літоўцаў перад стодам Пяркунаса вайдэлоткі палілі дубовыя дровы, падтрымліваючы нязгасны агонь — Зніч. Вера ў схаваную, таямнічую сілу агню была настолькі моцнай, што селянін не адважваўся ні заліць, ні плюнуць у агонь, ні кінуць у запаленую печку волас (каб не балела галава), ні перакрочыць праз вогнішча. У вераваннях і абрадах захавалася ідэя аб тым, што сапраўдны, ачышчальны агонь — гэта агонь, здабыты шляхам трэння. Цікавыя звесткі пра свяшчэнны агонь прыводзіць беларускі этнограф А.Сержпутоўскі: "Ва ўрачыстых выпадках, калі патрабуецца здабыць старадаўні свяшчэнны агонь, які мае ўласцівасць аберагаць чалавека ад таго ці іншага няшчасця, звяртаюцца да асаблівых прыёмаў, якія перадаваліся з роду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў род і дасягнулі нашага часу. Пры пабудове новай хаты трэба ладзіць новы ачаг, перавесці сюды ахоўнікаў-духаў, якія прызвычаіліся да старога ачага, а для гэтага неабходна здабыць свяшчэнны агонь і ўрачыста перанесці яго са старога ачага ў новы... Калі ў ваколіцы з'яўляюцца эпідэмічныя хваробы ці падзёж быдла ... таксама здабываюць свяшчэнны агонь, разводзяць па канцах вуліцы і з усіх бакоў паселішча вялікія вогнішчы, падтрымліваюць удзень і ўначы, каб такім чынам закрыць уваход непажаданым гасцям".

З культам агню звязаны і абрад "жаніцьба коміна" (першае запальванне святла ўвосень). Комін бялілі, спавівалі спелым хмелем, кветкамі. Калі запальвалі лучыны, то сыпалі на іх арэхі, дынныя семечкі, кавалкі саланіны і камякі масла.

І ў будзённым жыцці пры надыходзе сутоння агонь заўжды запальваўся з малітвай, і "калі пры гэтым пачнуць сварыцца нявесткі, то свякроў кажа:

— Годзе вам лаяцца, прытрымайце язык, ці не бачыце, што агонь запальваюць?"

Адно са старажытных уяўленняў пра агонь было звязана з яго ачышчальнай і гаючай уласцівасцю. Адсюль — цэлы шэраг магічных абрадаў, звязаных з ужываннем агню ў лекава-прафілактычных і ачышчальных мэтах. Так, у беларускіх сем'ях перад полымем качалі хворае дзіця, лічачы агонь сродкам, "які ачышчае ад усялякай "немачы" і засцерагае ад яе. Гэткая ж вера ляжыць у аснове звычаю скакаць праз купальскія агні. У гэтым жа сэнсе трэба тлумачыць і характэрны беларускі абрад: пры сустрэчы вясельнага поезда ў доме нявесты ля веснічак запальвалі вялікі куль саломы і ўсе паязджане мусілі праехаць праз агонь".

Яшчэ адной найважнейшай асаблівасцю культу агню была сувязь яго з сямейным ачагом, а значыць — з сямейна-родавым культам. У святы і нават у будзённыя дні беларусы вельмі неахвотна давалі агонь староннім, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі давалі, то з абавязковай умовай вярнуць узяты "жар" (палаючае вуголле ў гаршку), нават і астылым, у заклад чаго пакідалі сабе якую-небудзь рэч прасіцеля.

Добры гаспадар, насаджваючы ў свіране снапы першы раз у годзе, каб прасушыць іх для малацьбы, кідае звычайна сноп жыта ў свірнавы агонь. Гэта, несумненна, водгалас першабытных ахвяр агню.

Як функцыяніруе вобраз-сімвал агню ў мастацкай літаратуры? Традыцыйна ён ужываецца як сімвал абнаўлення, ачышчэння, выпрабавання.

І там, дзе сёння напрадвесні
Маланкі зіхацяць у хмарах,
Дзе сёння звоняць нашы песні,—
Успыхне полымя пажараў.
Ускалыхнем жыццё астрожным;
Народ устане з новай сілай
Непераможны, горды, грозны.
(М. Танк)

У "Сне на кургане" Я.Купалы агонь сімвалізуе перамену ў духоўным жыцці сялянства. Агонь павінен знішчыць прыземленае, бязмэтнае, цякучае існаванне вёскі — і тады адкрыецца шлях да духоўнага ўзвышэння селяніна.

Яшчэ адным сімвалам, звязаным з міфалагічнымі ўяўленнямі, з'яўляецца сімвал сонца.

Існаванне ўсёй жывой прыроды знаходзіцца ў самай шчыльнай сувязі з узыходам і заходам сонца, з разнастайнымі фазамі сонцастаяння. Зразумела, што пры поўнай залежнасці чалавека ад сонца ўвесь лад ягонага жыцця склаўся пад уплывам гэтай залежнасці; ён спрадвеку з радасцю і надзеяй на будучыню сустракаў штогод нараджэнне сонца, калі пачыналі прыбаўляцца дні; з удзячнасцю вітаў яго ўвесну, калі пасля працяглай зімы яно асвятляла і саграбала ягоную карміцельку, маці-сырую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямлю; з глыбокай павагай і хваляваннем схіляўся перад яго ўрачыстай і грознай веліччу. "Культ сонца быў тым больш развіты і ягонае пранікненне ў светапогляд народа тым глыбейшае і больш значнае, чым больш народ асвоіўся з мірнымі земляробчымі занятками і залежаў ад іх, а не ад вайны і рабунку", — адзначаў С.Максімаў.

Радавод у галоўнага нябеснага боства вельмі багаты. У славян было некалькі багоў, тым ці іншым чынам звязаных з сонечным культам: Даждзьбог (бог, які дае), Сварог, Хорс, Ярыла — веснавы бог сонца, Купала — бог летняга сонцастаяння, а таксама Траян, Каляда, Пераплут (валадар над гарэзлівымі сонечнымі зайчыкамі).

Вельмі шырокае распаўсюджанне мелі святкаванні, звязаныя з веснавым і восеньскім раўнадзенствам, з зімовым і летнім сонцастаяннем — Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Купалле і Багач. Характар гэтых абрадаў вызначаўся дзвюма істотнымі рысамі. Па-першае, гэта былі земляробчыя культы, бо сонца ўспрымалася як падавальнік ураджаю, апладняльнік зямлі. Па-другое, яны насілі эратычны характар, суправаджаючыся разгулам і оргіямі ("отрокам осквернение и девам растление").

У фальклоры сонца выступае ў якасці сімвала ўсяго светлага, яснага, вечнага. Яно дорыць цеплыню, забівае нячысцікаў, увасабляе справядлівасць. Яго баяцца цемрашалы, начніцы, совы. Але яно можа быць нядобрым, можа папаліць пасевы, высушыць крыніцы, наслаць засуху або град.

З салярнай сімволікай звязаны і шматлікія вобразы беларускіх казак: жар-птушка, свінка-залатая шарсцінка, певень-залаты грэбень, качка (альбо курыца), якая нясе залатыя яйкі, царыца з залатымі валасамі.

Такім чынам, у культурнай традыцыі, што аформілася на аснове складанага перакрыжавання фальклорных, антычных і хрысціянскіх уяўленняў, сонца трывала асацыіравалася са светлым пачаткам быцця, ведамі, розумам. Менавіта таму з'явіўся вогненны дыск у знакамітым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скарынаўскім знаку — своеасаблівай мадыфікацыі ідэі святла як ідэальнага адухоўленага пачатку, сімвала ведаў і гуманістычнага розуму, ідэі асветніцтва наогул.

Пройдуць чатыры стагоддзі, і ва ўмовах, калі беларускі народ заявіць пра сваё спрадвечнае права на самастойны сацыяльны і нацыянальна-культурны шлях, калі ўзнімецца полымя паходні за права "людзьмі звацца", скарынаўская традыцыя атрымае далейшае развіццё ў творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, іх паплечнікаў і паслядоўнікаў.

У іх творчасці сонца становіцца сімвалам магутнасці, няскоранасці чалавека:

Я — сын зямлі
і сонца вольны сын.

Я.Купала.

Гне худую спіну на чужым полі жняя, але ж — "ідзе ў сонцы, уся сама, як сонца".

Худую кабылку ўпгчаміў у саху араты, але — "сонцам выцірае ён свой воблік потны".

Пакрыўджаныя і зняважаныя беларусы з "А хто там ідзе?" быццам акрылялі ў "Песні сонцу":

Самое сонца ўзяць у рукі
І, як з паходняй, з ім ісці,
Святлом зніштожыць нашы мукі...

Вобраз-сімвал сонца дапамагае Я.Купалу намаляваць рамантычна-велічныя постаці няскоранага чалавека, да якога аўтар звяртаецца з заклікам: "Туды, дзе сонца з цемрамі змагаецца".

Сонца ў Я.Коласа адрозніваецца ад міфалагічнага сімвала, на думку А.Ненадаўца, непасрэднай блізкасцю, з'яднанасцю. Паэт узяў ад старажытнага вобраза ўсё толькі самае добрае, станоўчае. Сонца ў Я.Коласа прысутнічае ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найбольш светлых сцэнах. Яно нясе людзям радасць, шчодра дорыць "жмут залатых каласоў, абрусоў, паясоў". Асалоду прыносіць сонца чалавеку-працаўніку. Яно і "сагрэе мілым смехам", і "авее духам чыстых бораў, палёў, лугоў, нябёс прастораў", і "сыпне радасць нізкім стрэхам".

Мы ўжо згадвалі вядомыя словы М.Багдановіча пра тое, што наша стыхія — лес і балота. Сапраўды, лес — адзін з асноўных сімвалаў мастацкай карціны свету беларусаў. Карані яго абагаўлення — у сівой даўніне. Вось што піша Дж.Фрэзер: "Калі місіянер Іеранім Пражскі пачаў пераконваць язычнікаў-літоўцаў высекчы свае свяшчэнныя гаі, натоўп жанчын прасіў караля Літвы яго спыніць: разбураючы лясы, сцвярджалі жанчыны, ён разбурае дом Божы, які пасылаў народу дождж і святло сонца".

Адносіны да вобраза-сімвала лесу дваістыя. З аднаго боку (і гэта добра прасочваецца ў традыцыйнай лірыцы), лес заўсёды насцярожаны і варожы чалавеку; гэта дрымучы бор, дзе чалавек губляе дарогу да шчасця. Менавіта такім бачыць лес Сам з паэмы "Сон на кургане" Я.Купалы. Ён блукае па пушчы, збіты са сцежкі цемрай, таямнічымі гукамі і сакатаннем русалак:

Кругом нейкі шорах,
Жуда, пустата...

Матыў варожасці лесу да чалавека разгортваецца і ў іншых творах. Так, у баладзе "У купальскую ноч" галоўны герой нагадвае Сама ў пушчы, а ролю вартаўніка, схаванага ў пушчы багацця,— выконвае дух пушчы:

Бачыш, чуеш: царства наша
Вечна, схільна, неўгамонна.
Духа пушчы не застраша
Ні сякера, ні карона.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лес бачыцца як своеасаблівая моцная дзяржава, пранікнуць у якую не так проста, але неабходна, бо там зачынена таямніца ("Пушча знае, што бароне"), якую трэба адчыніць, каб чалавек стаў шчаслівым.

З другога боку, лес выступае як лепшы сябра, які дапамагае чалавеку знайсці душэўны спакой і раўнавагу.

Як я лесам іду, зважна думкі сную,
Аглядаю святую дубоў грамаду.
Там, як дома, сабе з пушчай песні пяю,
Зважна думкі сную, як я лесам іду.

Менавіта ў лес уцякаюць ад мітусні горада героі Ул.Караткевіча (аповесць "Чазенія"). Менавіта ў цесным і глухім, "як дно мора", лесе, дзе "надзея з верай нямелі", лірычны герой шукае песню і ліру, якія праклалі яму след да славы і далі тое, чаго ён жадаў ("Сон на кургане" Я.Купалы).

Пакланенне дрэвам увогуле было тыповым для паганцаў. Людзей, якія пашкодзілі святое дрэва, чакала суровае пакаранне.

Дж.Фрэзер апісвае выпадак у старажытнай Германіі. Злачынцу выразалі пупок і прыбівалі яго да той часціны дрэва, якую ён абадраў; потым яго вадзілі вакол дрэва да таго часу, пакуль вантробы цалкам не намотваліся на ствол. Пакаранне было накіравана на тое, каб замяніць засохлую кару дрэва тканкай злачынцы.

Для беларусаў такім свяшчэнным дрэвам быў дуб — сімвал велічы, сілы, магутнасці. Пакланенне дубу шчыльна злучаецца з адным з найважнейшых агульначалавечых архетыпаў — сусветным дрэвам.

Сусветнае дрэва як сімвал цэнтра сусвету — гэта свяшчэнная вось свету, якая пранізвае ўсю светабудову і складае яго стрыжань. Сусветнае дрэва злучае паміж сабой тры светы: верхні — неба, жытло багоў (верхавіна), сярэдні — зямля, месцазнаходжанне чалавека (ствол),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніжні — апраметная (карані). Словам, сусветнае дрэва - гэта не толькі цэнтр, апірышча і стрыжань светабудовы, але і яго зменшаная копія, мадэль.

Найбагацейшы матэрыял, які раскрывае сэнс вобраза-сімвала дуба, падабраны ў змястоўнай, насычанай і месцамі лірычнай кнізе А.Ненадаўца "Пакланіцеся дубу". Абапіраючыся на фалькорны матэрыял, міфы, паданні, археалагічныя знаходкі, аўтар апісвае язычніцкія абрады, звязаныя з пакланеннем дубу, функцыяніраванне сімвала ў народнай творчасці. Так, прыклады з песеннай лірыкі сведчаць пра тое, што дуб выступае ў якасці сімвала памяркоўнага бацькі, старэйшага брата, якія перажываюць за рана аддадзеную замуж дачку ці сястру:

Да дубу, зязюля, да дубу,
ой, рана-раненька да дубу.
Час табе, Марусенька, да шлюбу,
ой, рана-раненька да шлюбу.

Даволі часта з дубам самотным параўноўваецца лёс жанатага чалавека, якога адрываюць ад сям"і, забіраюць у салдаты:

Ой, у полі два дубочкі,
Схілілі вярхі да купочкі,
Схілілі вярхі з калінаю.
Цяжка жыці да й не жанатаму,
Я яшчэ цяжэй — каторы жанаты,
Ажаніўся — бяруць у салдаты.

У народных казках дуб захаваў сваю цудадзейную сілу. Ён выступае як уладар лесу, часам вельмі суровы, негаваркі, прымушае іншых жыхароў лесу выконваць сваю волю (казка "Гутарка дуба з грыбам").

У традыцыйным сэнсе гэты сімвал ужывае Я.Колас, не шкадуючы эпітэтаў, параўнанняў (нават гіпербал):

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“комель-слуп-скала дыша сілаю”, “угару зірнеш — шапка валіцца”. Аднак рэальныя прапорцыі нідзе не парушаюцца, дуб застаецца рэальным, канкрэтным, яго сіла і веліч — ад зямлі:

У глыб зямлі ўвайшлі
Карані яго.
Крэпка дуб стаіць,
Не варушыцца.

А вось у творчасці А.Вялюгіна рэальная карціна нібы перавернутая, дуб не трымаецца за зямлю, а сам трымае яе:

На карэннях на маіх —
нябачаны цяжар —
вісіць у кроплях дажджавых
зямлі зялёны шар.

Больш за тое, дуб “падняў і сонца на галлі пад посвіст салаўёў”. Гэта ўжо погляд нашага сучасніка, чалавека касмічнай эры.

Той жа погляд і ў А.Куляшова. У вершы “Сасна і бяроза” дрэвы трымаюць “жывымі рукамі карэнняў сваіх” зямлю і жыццё на ёй:

Што будзе з зямлёй,
Калі выпусцяць з рук
сасна і бяроза?

Вывучэнне сімвалаў як цэнтральнага ўтварэння ўсяго комплексу знакава-моўных выразаў, як найбольш ёмістай і канцэнтраванай формы выяўлення культурных каштоўнасцей прыцягвае ўвагу шматлікіх даследчыкаў.

Наперадзе — праца па мадэліраванні інварыянтнай сістэмы базавых сімвалаў, якія вызначаюць мастацкую карціну свету беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ